***А.М. Аляхновіч,*** *прафесар*

# ПРЫНЦЫПЫ І МЕТАДЫ ЎВАСАБЛЕННЯ РЭЖЫСЁРАМ НАРОДНАЙ ПЕСНІ Ў СВЯЦЕ

У народным свяце музыка гучыць 90–95%, астатняе належыць іншым мастацкім сродкам: слову, пластыцы і харэаграфіі, дэкаратыўна-прыкладному мастацтву, уласна рэжысуры. Менавіта таму выкарыстанне народнай песні ў свяце набывае для прафесійнай дзейнасці рэжысёра першаступеннае значэнне. Тэорыя і асабістая практыка аўтара дазваляюць вылучыць наступныя прынцыпы і метады ўзнаўлення рэжысёрам фальклорнай песні ў свяце.

*Вывучэнне міфалагічнага светапогляду.* Народная песня, асабліва абрадавая, заключае генетычны код мыслення старажытнага чалавека, адносіны да рэчаіснасці. Рэжысёру нельга недаацэньваць значэнне падрыхтоўчага этапа пры інтэрпрэтацыі народнай песні ў свяце, таму што яна не ўкладваецца ў межы слоў і нотных знакаў. Нябачнымі ніткамі фальклорны твор звязаны з жыццём чалавека мінулага, якое можна зразумець, толькі яго вывучаючы і асэнсоўваючы.

Вядома, каб зразумець літаратурны або музычны твор, трэба ведаць яго аўтара. Так і ў фальклоры: трэба зразумець тых, хто склаў твор. Толькі ўсведамляючы адказы на пытанні: хто такі чалавек? Адкуль усё ўзялося? Як усё ўладкавана? – рэжысёр можа зразумець аўтара народнай песні, якім з’яўляецца народ.

Чалавек мінулага не мог растлумачыць многія з’явы: маланку, агонь, дождж, навадненне, землятрус і інш. Ён адчуваў сваю залежнасць ад стыхійных з’яў прыроды і імкнуўся ўздзейнічаць на іх у патрэбным для сябе кірунку, каб забяспечыць уласныя дабрабыт і шчасце. На гэтай глебе ўзніклі вусныя тэксты, якія мелі канкрэтныя практычныя функцыі: прыметы як назіранні, што ўтварылі аснову земляробчага календара, загадкі як таямнічая мова, абрадавая паэзія – сродак зносін з замагільным светам, нарэшце, песні, танцы, міміка, пантаміма, элементы тэатра, якія былі часткай абрадавых рытуальных дзеянняў. Менавіта ў той час сфарміравалася большасць фальклорных вобразаў і персанажаў, якія адлюстроўвалі светаўспрыманне ў старажытнасці. Але погляды на свет, якія былі характэрны для тысячагоддзяў існавання і развіцця людзей, не маглі зусім знікнуць з памяці чалавека, адысці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў нябыт. Мінулае захоўваецца ў генетычнай памяці і час ад часу праяўляецца. Вось чаму рэжысёру важна вывучаць асаблівасці міфалагічнага мыслення, каб разумець фальклор як з'яву культуры. Паводле сведчання вядомага вучонага Мірчэ Эліадэ, старажытны чалавек адчуваў сябе непарыўна звязаным з космасам і касмічнымі рытмамі, а сучасны – з гісторыяй. Такім чынам, рэжысёр абавязаны ведаць, што міф для чалавека мінулага – не выдумка, не аповед аб прыгодах. Гэта светапогляд старажытнага чалавека, які набывае форму апавядання. Міф выступаў для яго як інструмент пазнання свету і выконваў тую ролю, якую для нас маюць рэлігія, філасофія, навука і іншыя галіны чалавечай дзейнасці.

*Параўнальны аналіз варыянтаў песеннага фальклору.* Важны момант увасаблення фальклорнай песні рэжысёрам у свяце заключаецца ў неабходнасці па магчымасці пазнаёміцца з яе рознымі варыянтамі, паэтычнымі тэкстамі. Параўноўваючы іх, рэжысёр можа зразумець, чаму песня была складзена, як магла ўзнікнуць, калі ці чаму прысвячаецца, якія і як перадае пачуцці і інш. Гэтыя звесткі даюць рэжысёру магчымасць дапамагчы выканаўцам больш удумліва і глыбока падыходзіць да ўзнаўлення твора ў свяце, раскрыць яго характар, пачуцці.

*Вызначэнне мясцовай спецыфікі фальклорнага твора.* Для кампетэнтнага ўзнаўлення народнай песні ў свяце рэжысёру трэба вызначыць яе рэгіянальную, мясцовую прыналежнасць. Вядома, што кожны рэгіён мае свае асаблівасці, якія праяўляюцца ў жывой гутарковай мове, дыялектах, манеры выканання і інш. Рэжысёру неабходна пазнаёміцца з мясцовымі звычаямі, абрадамі, музычным інструментарыем, народнымі выканаўцамі і ўмельцамі, бо народная песня звязана з побытам чалавека. Мясцовая спецыфіка надае яе выкананню непаўторную унікальную спецыфіку. У народзе і сёння можна пачуць, што выкананне адной і той жа песні ў суседніх вёсках гучыць па-рознаму, значна адрозніваецца манерай і характарам выканання.

*Узнаўленне народнай песні ў свяце ў адзінстве з іншымі жанрамі фальклору.* Гэты прынцып грунтуецца на метадалагічным палажэнні выдатнага даследчыка першабытнага сінкрэтызму А.Н.Весялоўскага, які паказаў не толькі непарыўную сувязь жыццёвай практыкі людзей з мастацтвам, але і нерасчляняльнасць у самой мастацкай творчасці яго родавых або жанравых адрозненняў. Узаемасувязь і ўзаемаабумоўленасць у свяце музыкі, паэзіі, танца, гульні, мімікі, касцюма вызначаюць сінкрэтычную прыроду

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народнай песеннай творчасці, узбагачаюць яскравымі фарбамі рытуальныя дзеі.

*Выкарыстанне народнай песні ў свяце ў складзе абраду або яго фрагмента.* Народная песня заўсёды шчыльна знітавана з рытуальным дзеяннем, тлумачыць яго, раскрывае змест і сэнс учынкаў і паводзін вобразаў і персанажаў, сімволіку прадметаў і рэчаў. Напрыклад, веснавыя песні суправаджаюць кожны крок абрадавых дзей, рэгламентуюць сацыяльныя і этычная нормы ўзаемаадносін удзельнікаў рытуалу, надаюць яму відовішчны аспект. Паказ са сцэны абраду і выкананне пры гэтым песень ствараюць натуральнасць, сапраўднасць таго, што адбываецца ў святочным развіцці, далучаюць прысутных да з'явы.

*Узнаўленне жанравай спецыфікі музычнага фальклору.* Кожны жанр народнай песні, асабліва абрадавай, мае адметныя рысы. Так, песні зімовыя вызначаюцца, як правіла, дакладным рытмам, дынамікай, разнастайнымі сродкамі паэтыкі: параўнаннямі, метафарамі, псіхалагічнымі паралелізмамі, а найперш гіпербаламі. Песні веснавыя іншыя па музычнай і паэтычнай пабудове. Яны нясуць яскравы эмацыянальны пачатак, спалучаючы драматычныя, танцавальныя, песенныя элементы, утрымліваюць разнастайныя мелізмы, выклічнікі, гукі недакладнай вышыні, перапынкі паміж складамі пры выкананні і інш. Яны адлюстроўваюць абуджэнне прыроды, сувязь з ёю чалавека, яго жаданне адчуць водгук ад звароту да яе, жыць у суладдзі з рэчаіснасцю, задобрыць стыхію, уздзейнічаць на яе для забеспячэння дабрабыту і шчасця. Песні вясельныя шчыльна звязаны з абрадавым дзеяннем. Ніводзін эпізод вясельнай рытуальнай дзеі не абыходзіцца без песні, яна дакладна рэгламентуе, што і як рабіць кожнаму ўдзельніку вяселля, як паводзіць сябе маладым, раскрывае сімволіку прадметаў і рэчаў, скіраваных на дзетанараджэнне, і інш. Найбольш яскравыя моманты вяселля, такія як дзявоцкі вечар, сустрэча маладых, каравай, рух вясельнага поезда, эмацыянальна насычаны песняй. Нездарма некаторыя даследчыкі называюць вяселле "народнай операй". Вясельныя песні характарызуюцца ўстойлівымі меладычнымі і рытмічнымі інтанацыямі, якія падкрэсліваюць урачыстасць з'явы, лёгка запамінаюцца на слых, дакладна перадаюць нацыянальныя асаблівасці беларускага меласу.

*Тэатралізацыя фальклорных песень.* Для рэжысёра веданне жанру народнай песні дапамагае знаходжанню яе тэатралізацыі ў свяце, рухаў, разыгрывання, перадачы яе характару. Вобраз песні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

патрабуе адпаведных жэстаў, мізансцэн і інш. Важным метадалагічным прынцыпам увасаблення рэжысёрам народнай песні ў свяце з’яўляецца народная тэрміналогія вызначэння фальклорнага выканання ў жывым бытаванні – “народная песня не проста спяваецца, яна іграецца”. Для рэжысёра гэта палажэнне азначае неабходнасць своеасаблівага рэжысёрскага аналізу народнай песні: разуменне кампазіцыі з завязкай дзеяння, развіццём сюжэта, кульмінацыяй, канфліктам, фіналам, увядзеннем персанажаў, выкарыстаннем касцюмаў, дэкарацый, ператварэннем яе інтэрпрэтацыі ў “маленькі спектакль”, прадстаўленне.

Як паказвае практыка, многія кіраўнікі і выканаўцы фальклорных калектываў не валодаюць рэжысёрскімі здольнасцямі і таму на сцэне можна бачыць нецікавае статычнае выкананне фальклорных песень, прымітывізм і вульгарызм інсцэніроўкі, адсутнасць эстэтычнага густу і інш.

Пры такім становішчы выканання народных песень роля рэжысёра становіцца вызначальнай. Ён можа і абавязаны аказаць прафесійную дапамогу ў рэжысуры тым, хто займаецца ўзнаўленнем народных песень у свяце, зрабіць гэта на высокім мастацкім узроўні, узбагаціць выкананне “ігрой”, навыкамі і прыёмамі святочнай рэжысуры.

Па сваёй прыродзе песенны фальклор пранізаны элементамі народнага тэатра, гульні, пантамімы, мімікі. Асаблівасць гульнёвага пачатку фальклорнай песні значна ўзрастае, калі яна пападае на сцэну. На сцэне вядучай функцыяй народнай песні становіцца мастацкая, эстэтычная. Пры гэтым важна, каб яе ўзнаўленне вызначалася пачуццём эстэтычнай меры тэатралізацыі, што, на жаль, не заўсёды практычна адбываецца. Справа ў тым, што не ўсе валодаюць навыкамі і прыёмамі тэатралізацыі.

Ва ўмовах свята рэжысёр павінен выступаць не толькі як сцэнарыст, уласна рэжысёр, арганізатар святочных дзей, але і як практык стварэння ўмоў для тэатралізацыі, настаўнік для тых, хто не валодае прынцыпамі і метадамі сцэнічнага ўвасаблення фальклорнага матэрыялу.

Тэатралізацыя народнай песні ў свяце рэжысёрам патрабуе:

– аб’яднання праграмы выступлення адзіным сюжэтам, сцэнарыем;

– авалодання навыкамі і ўменнямі ўвасаблення рухаў, мізансцэн, мімікі, пластыкі і інш.;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– ілюстрацыі зместу народных песень сродкамі танца, увядзеннем вобразаў і персанажаў, выкарыстаннем касцюмаў, прадметаў і рэчаў і інш.;

– раскрыцця сімволікі фальклорнай песні сродкамі рэжысуры і акцёрскага майстэрства і інш.

Такім чынам, для кампетэнтнага выкарыстання рэжысёрам народнай песні ў свяце неабходна валодаць сістэмай тэарэтычных і метадычных падыходаў, накіраваных на захаванне фальклорнай першакрыніцы, раскрыццё ва ўмовах святочнай дзеі эстэтыкі фальклорнага твора і глыбіннай сутнасці міфалагічнага мыслення чалавека мінулага з улікам сучасных поглядаў і густаў людзей, у тым ліку моладзі.

---

1. *Аляхновіч, А.М.* Беларуская традыцыйная музычная спадчына / А.М.Аляхновіч. – Мн., 2000.

2. *Аляхновіч, А.М.* Беларуская песня ў школе / А.М.Аляхновіч. – Мн., 2004.

3. *Веселовский, А.Н.* Синкретизм древнейшей поэзии и начало дифференциации поэтических родов: в 8 т. / А.Н.Веселовский. – СПб., 1913. – Т. 1. – С. 227–392.

4. *Рыбаков, Б.А.* Язычество древних славян / Б.А.Рыбаков. – М., 1981.

5. *Элиадэ, Мирче.* Космос и история / Мирче Элиадэ. – М., 1987. – С. 236.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ